1. *Клімковіч С., Пісьменная І.* "Песняры" // Маладосць. — 1974. - № 11. — С. 176—177).
2. *Яшкин В.* "Песняры" // Молодежная эстрада. — 1978. — № 6. — С. 153.
3. *Сакалоў-Кубай Г.* Новыя касцюмы "Песняроў" // ЛіМ. — 1978. — 11 студз. — С. 9.
4. *Мільто І.* Кожны раз па-новаму // ЛіМ. — 1980. — 25 крас. — С. 11.

**А.А.Каспярук,**
*суіскальнік*

# РОЛЯ КУЛЬТУРЫ Ў РАЗВІЦЦІ СІСТЭМЫ ВОІНСКІХ КАШТОЎНАСЦЕЙ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

Дынаміка грамадскага жыцця сведчыць аб тым, што не ўсе праблемы сёння маюць эфектыўнае рашэнне, а гэта стварае фон, на якім фарміруецца культура дапрызыўнай моладзі, у тым ліку і ў адносінах да ваеннай службы. У значнай колькасці нашых грамадзян сфарміраваўся наконт арміі трывалы стэрэатып, вытокі якога бяруць пачатак з часоў распаду Савецкага Саюза. Тады падвяргаліся крытыцы Узброеныя Сілы (дзеля аб'ектыўнасці заўважым, у многім і справядліва), што зніжала прэстыж ваеннай службы. Сёння ўжо іншая сітуацыя. Апытанні грамадзян сведчаць аб узрастанні даверу да арміі, сілавых структур дзяржавы. Аднапалярны свет з яго "гуманітарным" сцэнарыем пакарання Югаславіі, падзеі на Бліжнім Усходзе, ваенныя поспехі талібаў і зацягнуўшаяся контртэрарыстычная аперацыя Расіі ў Чачні, шэраг буйных ваенных катастроф і аварый змянілі грамадскую думку ў ацэнцы ролі арміі ў сучасным жыцці. Разам з тым прэстыж ваеннай службы, жаданне служыць у маладых людзей яшчэ не тыя, што задавальнялі б грамадства. Менавіта таму пытанне пра ролю культуры ў развіцці сістэмы воінскіх каштоўнасцей абаронцаў Айчыны з'яўляецца надзённым.

У кожнай культурнай сістэме закладзена імкненне да каштоўнасцей і ідэалаў, таму што яны выступаюць важным кампанентам культурнай прасторы, рэгулятарам і асновай культурнай палітыкі. Гэтая сістэма фарміруецца на аснове патрэбнасцей. Каштоўнасныя арыентацыі выступаюць своеасаблівымі стымуламі культурных паводзін чалавека.

Пераход індывіда ад асэнсавання сваіх патрэбнасцей да індывідуальна-групавых каштоўнасных арыентацый адбываецца пад складаным уздзеяннем дзяржаўных і сацыяльных інстытутаў, кіно, тэлебачання, мастацкай літаратуры, рэлігіі, культуры, у тым ліку і ваеннай. Як сведчыць гісторыя арміі, ваеннае асяроддзе паспяхова развівае і культывуе працэсы і з'явы, якія аб'ядноўваюць ваенную арганізацыю знутры. Перш за ўсё гэта афіцэрскія традыцыі, суворaўская сістэма выхавання асабовага саставу, ваенная гісторыя, культ воінскага гонару і доблесці, ваенная сімволіка, рытуалы, дысцыпліна і строй, аўтарытэт камандзіраў, ваенная тэрміналогія і лексіка.

Ваенная гісторыя краіны, яе перамогі і паражэнні захоўваліся ў рэлігійных вобразах, літаратурных творах, музыцы, мастацкіх творах, яны сталі неад'емнай часткай айчыннай духоўнай культуры. Ва ўмовах пераўтварэння нашага грамадства важнай застаецца задача захавання і ўзнаўлення сістэмы воінскіх каштоўнасцей, карані якіх у ментальнасці, народнай свядомасці, традыцыях, атрыманых ў спадчыну сучасным пакаленнем ад нашых продкаў. Пры гэтым неабходна ўлічваць і творча перапрацоўваць пазітыўны і негатыўны вопыт, засвойваць лепшыя дасягненні сусветнай і айчыннай ваеннай культуры.

Для павышэння эфектыўнасці мэтанакіраванага ўздзеяння культурнай палітыкі грамадства і арміі лічым неабходным наступнае.

У сувязі з якасна новымі зменамі ў свядомасці моладзі адносна ваеннай службы трэба прыняць комплексную дзяржаўную праграму, якая вызначала б канкрэтныя шляхі духоўнага развіцця дапрызыўнай моладзі, сістэму ваенна-прафесійных каштоўнасцей ваеннаслужачых, і ў першую чаргу афіцэраў.

Пры ўзрастаючым агульнаадукацыйным патэнцыяле прызыўной моладзі (у яе шырока распаўсюджаны негатыўныя ўстаноўкі ў адносінах да ваеннай службы) пажадана актывізаваць ваенна-патрыятычнае выхаванне ў навучальных установах.

У мэтах развіцця і падтрымкі шэфскіх, ваенна-патрыятычных сувязей, перадачы існуючых лепшых воінскіх культурных традыцый і каштоўнасцей сучаснаму пакаленню ў воінскіх часцях і падраздзяленнях неабходна ствараць маладзёжныя клубы і аб'яднанні.

Міністэрству адукацыі і Міністэрству абароны мэтазгодна правесці серыю навукова-практычных семінараў для распрацоўкі праграмы па вырашэнні праблем ваеннаслужачых тэрміновай

службы з мэтай яе адпаведнасці культурным патрэбнасцям і каштоўнасцям сучаснай моладзі.

Сілавым структурам разам з Міністэрствам культуры і Дзяржаўным камітэтам па друку пажадана аб'явіць сярод творчай моладзі конкурс па распрацоўцы культурнай праблематыкі ваеннай службы, з улікам асаблівасцей фарміравання маральнага аблічча абаронцаў Айчыны, іх ваенна-прафесійных каштоўнасцей.

Змест і накіраванасць каштоўнасных арыентацый моладзі ў адносінах да ваеннай службы — гэта барометр, які паказвае стан двух асноўных сацыяльных суб'ектаў — грамадства і асобы — у бачанні ролі культуры. Важна ведаць, што сістэма сацыякультурных каштоўнасцей абаронцаў Айчыны, ваенная культура краіны — частка нацыянальнай культуры.

**Т.В.Карнажыцкая,**
*аспірантка*

## ІНТЭГРАЦЫЯ РОЗНЫХ ВІДАЎ МАСТАЦТВА Ў СІСТЭМЕ КУЛЬТУРЫ

Інтэграцыя ў дакладных навуках сёння разглядаецца як працэс, які з'яўляецца вынікам узнікаючых паміж з'явамі і сістэмамі ўзаемаабумоўленых сувязей, заснаваных на ўзаемадзеянні разнародных элементаў. Інтэграцыі папярэднічаюць працэсы збліжэння і ўстанаўлення кантактаў, якія ў сваю чаргу ёсць вынік праяўлення падабенства і агульнасці.

У галіне мастацкай культуры пытанне аб інтэграцыі ляжыць у плоскасці ўзаемадзеяння розных відаў мастацтва. Інтэграцыя розных відаў мастацтва можа мець некалькі накірункаў: сінтэз розных тэхнік, сродкаў выразнасці, стыляў і накірункаў у асобных відах мастацтва; сінтэз розных відаў мастацтва; сінтэз мастацтва з іншымі формамі праяўлення культуры (спортам, навукай, адукацыяй, рэлігіяй, філасофіяй і інш.).

Першапачаткова мастацтва было сінкрэтычным і будавалася на непадзельнасці мастацкага мыслення. Узнікненне розных відаў мастацтва з'явілася вынікам развіцця чалавечай культуры. Працэс узнікнення відаў у мастацтве працягваецца да нашых дзён, пашырае сваю разнастайнасць. Частка новых відаў мастацтва ўзнікае ў выніку інтэграцыі раней існаваўшых (святламузыка,